# ТЭХНАЛОГІЯ ДЫФЕРЭНЦАВАНАГА НАВУЧАННЯ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: МЭТАЗГОДНАСЦЬ ВЫКАРЫСТАННЯ

**Чыкаванава Кацярына Анатольеўна**
наменнік дырэктара па вучэбнай рабоце, Аршанскі каледж
Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава
(г. Орша, Беларусь)

Ідэі асабасна-арыентаванай адукацыі атрымалі вялікую папулярнасць. Гэта тлумачыцца шэрагам прычын, галоўная з якіх заключаецца ў тым, што навучэнец павінен быць суб'ектам навучання. Суб'ектам ён стане толькі ў выпадку, калі будзе актыўна ўдзельнічаць у працэсе авалодання ведамі, уменнямі і навыкамі. Пры выкарыстанні асобасна арыентаваных тэхналогій улічваюцца індывідуальныя асаблівасці навучэнца, суб'ектыўны вопыт пазнання і прадметная дзейнасць, пры гэтым прызнаецца права выбару ўласнага шляху самаразвіцця. Індывідуальна-тыпалагічныя асаблівасці навучэнцаў, формы іх узаемадзеяння ўлічвае тэхналогія дыферэнцыраванага навучання. Дыферэнцыяцыя ў навучанні і адукацыі – гэта арганізацыя вучэбнай дзейнасці, пры якой з дапамогай адбору зместу, форм, метадаў, тэмпаў, аб'ёму навучання ствараюцца аптымальныя ўмовы для засваення ведаў кожным вучнем [1, с. 39].

Арганізацыя дыферэнцаванага навучання па тэхналогіі шматузроўневай унутранай дыферэнцыяцыі ажыццяўлялася намі пры падзеле адной вучэбнай групы на некалькі падгруп. У такім выпадку была выдзелена група тых навучэнцаў, што слаба паспяваюць, яна складае першы ўзровень, другі ўзровень складае група "сярэдніх" навучэнцаў, трэці ўзровень – "моцных". Складанасць работы для груп звычайна вызначае выкладчык. Як правіла, для слабых вучняў спрашчаецца заданне, яно можа выконвацца разам з педагогам, можа быць зменшана колькасць заданняў, выкладчык часта прымяняе прыём паўторнага тлумачэння, для дапамогі выкарыстоўваюцца памяткі, алгарытмы, схемы выканання заданняў, сістэма наводзячых пытанняў. Групе "моцных" навучэнцаў можа быць прапанавана большая колькасць заданняў, практыкаванні і заданні вымагаюць самастойнай работы, носяць творчы характар, прадугледжваюць прымяненне ведаў у нестандартнай сітуацыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Неабходна адзначыць, што створаныя вучэбныя падгрупы мабільныя, фарміруюцца ў залежнасці ад вывучаемага матэрыялу і мэты ўрока: напрыклад, выпрацаваць уменні аналізу мастацкіх твораў розных тыпаў, скласці характарыстыкі герояў твора і г.д. Так, напрыклад, адным з асноўных крытэрыяў дыферэнцыяцыі на ўроках беларускай літаратуры, на наш погляд, з'яўляецца літаратурная падрыхтаванасць навучэнцаў. Для выяўлення яе ўзроўняў можна выкарыстоўваць наступны спосаб: навучэнцам прапануецца прачытаць частку апавядання беларускага аўтара, затым яны павінны выпісаць тыя фрагменты тэксту, якія найбольш прыцягнулі іх увагу, прааналізаваць іх. На наступным этапе можна прапанаваць "скласці" зборнік твораў гэтага пісьменніка, гэта значыць, адабраць творы, якія можна ўключыць у адзін зборнік, прыдумаць назву такому зборніку, абгрунтаваць свой выбар, растлумачыць афармленне вокладкі. Такія віды работы дазваляюць, па-першае, больш глыбока і дакладна выявіць асаблівасці мастацкага ўспрымання навучэнцаў, па-другое, вызначыць іх сацыяльна-эстэтычныя ўстаноўкі, па-трэцяе, вызначыць узровень іх літаратурнага развіцця і асаблівасці мыслення па якасці рашэння літаратурнай задачы. Акрамя названага, выявіць узровень літаратурнай падрыхтоўкі дапамагаюць заданні тыпу: правесці самастойны аналіз невялікага мастацкага твора (гэта можа быць верш, апавяданне, пэўны эпізод з аповесці, рамана і інш.), супаставіць творы па тэматыцы, жанру, скласці творчыя і мастацкія пераказы, стварыць сцэнарый да твора або яго часткі, скласці рэжысёрскія каментарыі, прыдумаць пачатак да твора, напісаць сачыненне па пачатку і г.д.

У працэсе спасціжэння мастацкага тэксту навучэнец атрымлівае веды пра маральныя паняцці і катэгорыі, асноўныя якасці асобы, развіваецца яго ўменне адчуваць, фарміруюцца асобасныя адносіны да прачытанага, якія вызначаюцца асобаснымі адносінамі навучэнца да агульначалавечых праблем. У сувязі з гэтым аналіз мастацкага тэксту павінен накіроўвацца на шматмернае засваенне маральных праблем у кантэксце твора, на выяўленне ў ім асобасна значнага для кожнага навучэнца. Таму наступным крытэрыем дыферэнцыяцыі пры вывучэнні літаратурных твораў павінна стаць каштоўнасна-маральная арыентацыя кожнага навучэнца, якая вызначаецца сістэмай маральнай выхаванасці асобы.

Пры чытанні мастацкага твора ў навучэнцаў дамінуе адзін з падыходаў да яго ўспрымання: аналітычны ці эмацыянальна-вобразны. Гэтая асаблівасць успрымання кладзецца ў аснову дыферэнцаванага падыходу да навучання літаратуры. Вывучэнне беларускай літаратуры ўяўляе сабой сінтэз двух накірункаў: эмацыянальна-вобразнага і аналітычнага засваення мастацкага тэксту. Таму на практыцы мы дабіваліся таго, каб навучэнцы актыўна выкарыстоўвалі гэтыя два накірункі засваення твора. Гэта неабходна, каб не збядняць эмацыянальны, эстэтычны, духоўны, маральны свет, створаны аўтарам ў мастацкім творы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мастацкі твор можа быць успрыняты навучэнцамі на розных узроўнях. Першы ўзровень – канстатуючы, ён прадугледжвае ўспрыманне твора без асэнсоўвання сувязей, якія існуюць паміж яго часткамі. Другі ўзровень – аналітычны, навучэнцы гэтага ўзроўню здольны адлюстроўваць тое, што ўспрымаецца, ва ўзаемасувязі ўсіх яго кампанентаў, разумець лагічную сістэму вобразаў мастацкага твора, гэта значыць, успрыняць мастацкі твор у яго форме. Трэці ўзровень – цэласны, гэта ўсведамленне мастацкага твора ў адзінстве формы і зместу, асэнсаванне адносін аўтара да таго, што адлюстравана, уменне самастойна разабрацца ў праблемах твора, выказаць свае адносіны да яго. У залежнасці ад таго, на якім узроўні ўспрымае тэкст навучэнец, на занятках па аналізу мастацкага твора ён уваходзіць у першую, другую ці трэцюю групу (з канстатуючым, аналітычным ці цэласным узроўнем успрыняцця мастацкага твора адпаведна).

Навучэнцам з канстатуючым узроўнем успрыняцця тэксту выкладчык аказвае большую дапамогу. Ён вучыць іх аналізаваць мастацкі твор, не проста вызначаючы яго тэму, ідэю, праблемы, а звяртаць увагу на тое, што з тэмы вынікае ідэя твора, якой падпарадкоўваюцца праблемы. Мэтазгодна прапаноўваць навучэнцам схемы, алгарытмы, па якіх яны змогуць прааналізаваць твор ці скласці характарыстыку дзеючых асоб.

Работа з навучэнцамі аналітычнага ўзроўню ўспрыняцця мастацкага твора накіраваная на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў ім, фарміравання разумення адзінства формы і зместу твора. Навучэнцам з цэласным узроўнем успрыняцця мастацкага твора прапаноўваліся наступныя віды работ: самастойны агляд крытычнай і літаратуразнаўчай літаратуры па дадзенай тэме, пошук адказаў на праблемныя пытанні. Карысныя заданні на супастаўленне твораў аднаго аўтара, але розных па тэме, параўнанне твораў розных аўтараў агульнай тэматыкі, правядзенне паралеляў паміж адлюстраваным часам і днём сённяшнім.

У выніку мэтанакіраванай работы навучэнцы ўспрымаюць твор на аналітычным ці цэласным узроўні. Так, назіранні, праведзеныя за навучэнцамі 241 групы Аршанскага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава паказалі наступныя вынікі:

| Курс навучання | Узровень успрымання мастацкага твора | | |
|---|---|---|---|
| | канстатуючы | аналітычны | Цэласны |
| 1 | 19,2% (5 чалавек) | 61,6% (16 чалавек) | 19,2% (5 чалавек) |
| 2 | – | 57,6 % (15 чалавек) | 42,4% (11 чалавек) |

З прыведзеных дадзеных бачна, што выкарыстанне шматузроўневай унутранай дыферэнцыяцыі на ўроках беларускай літаратуры прынесла свае вынікі, гэтым і тлумачыцца мэтазгоднасць выкарыстання дадзенай тэхналогіі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. Коджаспирова, Г. М. Педагогический словарь / Г. М. Коджаспиров, А. Ю. Коджаспиров. – М. : Академия, 2001. – 176 с.

…ив библиотеки МГУ имен…